**Кузьма Кісялёў быў адным з нямногіх савецкіх чыноўнікаў, для каго жалезная заслона адчынялася. Ён з'яўляўся першым міністрам замежных спраў БССР, прадстаўляў нашу краіну падчас стварэння і далейшай дзейнасці ААН і знаходзіўся на гэтай пасадзе ажно 22 гады. Пры гэтым ён ніколі не ішоў супраць свайго сумлення і, займаючы такую высокую пасаду, рабіў усё, што мог, для звычайных людзей... Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з дзецьмі Кузьмы Кісялёва, якія расказалі, навошта іх бацька хадзіў на асабісты прыём да Сталіна, як ахвяраваў уласнай кар'ерай дзеля адкрыцця анкалагічнага цэнтра ў Бараўлянах і чаму кожны год атрымліваў 17 тэлеграм з афрыканскіх краін. Таксама яны прыгадалі, як Кісялёў адстаяў сапраўдную назву Беларусі і вазіў з сабой за мяжу беларускіх пісьменнікаў, «каб пагледзелі свет»...**


Васіль КІСЯЛЁЎ і Алена КРУГЛІ...

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# КУЗЬМА КІСЯЛЁЎ. ПРЫРОДЖАНЫ ДЫПЛАМАТ

## «Пасты прыходзяць і сыходзяць, а бальніцы застаюцца»

Дачка Кісялёва **Алена КРУГЛІК, кандыдат фізіка-матэматычных навук,** пра бацьку ўзгадвае з цеплынёй і любоўю, прыгадвае і тлумачыць, дзякуючы чаму такі няпросты шлях яму ўдалося прайсці годна. Сын, **Васіль КІСЯЛЁЎ, кандыдат гістарычных навук,** свой аповед грунтуе на дакументальна правераных звестках, на тых фактах, якія мелі важнае значэнне не толькі ў лёсе яго бацькі, але і ўсёй краіны...

Утульная кватэра ў самым цэнтры сталіцы, каля Камароўскага рынку. Сваім афармленнем яна яшчэ нечым нагадвае савецкую эпоху. Гасцінныя Кісялёвы адразу сталі паказваць памятныя знакі, якія калісьці былі ўручаны бацьку. І на падставе гэтых, зусім невялікіх, прадметаў усплывалі асобныя гісторыі і вымалёўваўся твар мінулага часу...

### НЯМЕЦКАЯ РАЗВЕДКА БЫЛА ПАДМАНУТА

На невялікім значку кіраўніка дэлегацыі Беларусі ў ААН адбіта «Лондан, 1945». І гэта зусім не памылка і не блытаніна, хаця ўстановачная канферэнцыя ААН насамрэч адбывалася ў Сан-Францыска. Такія значкі былі адліты наўмысна, каб заблытаць нямецкую разведку...

У лютым 1945 года Чэрчыль, Рузвельт і Сталін у Ялце дамовіліся пра стварэнне ААН. Тады ж было вырашана і тое, што, акрамя СССР, на ім будзе прадстаўніцтва Беларусі і Украіны — краін, якія найбольш пацярпелі ў вайне. Германія ў тыя часы мела адну з мацнейшых разведарганізацый у све-

СССР, а таксама ў міжнародным аддзеле ЦК КПСС. Толькі пасля гэтага ён падымаўся на трыбуны ААН і казаў прамову. І ні аднаго слова ў ёй нельга было змяніць. Інакш давялося б расплачвацца за гэта...

Але на гэты раз Кісялёў уставіў ажно два абзацы і прачытаў іх з трыбуны міжнароднай арганізацыі. Першае, пра што ён казаў, было тое, што ў Беларусі ўжо будуюць спецыялізаваную бальніцу па барацьбе з ракавымі захворваннямі. Другое — што запрашае кіраўніцтва ААН прыехаць паглядзець, як ідзе будаўніцтва. Гэтую інфармацыю размясцілі ўсе газеты таго часу, перадалі яе па тэлебачанні, радыё, у тым ліку амерыканскім, еўрапейскім, азіяцкім.

Дзявацца не было куды, і з Масквы другі раз выдзелілі фінансы.

Па запрашэнні Кісялёва ў Мінск прыляцеў генеральны сакратар ААН Дак Хамаршэльд.

рылася? Што прымусіла прыйсці па асабістым пытанні?» Кісялёў расказаў, што яго супрацоўнікаў арыштавалі і дадаў: «Я не кажу, што органы няправільна арыштавалі, што яны памыліліся. Але іх маглі ўвесці ў зман. Гэта сумленныя людзі, верныя камуністы. Усе да аднаго — франтавікі. Таму я вас прашу разабрацца. І неяк вырашыць гэтае пытанне станоўча». Сталін пахадзіў па сваім кабінеце і адказаў: «Мы да вас ніякіх прэтэнзій не маем. Едзьце ў Мінск, набірайце новых супрацоўнікаў. Вам дапамогуць з іх адборам. І працуйце, мы вам верым».



ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

С полным текстом документа можно ознакомиться в библиотеке